■ АЎТАМАБІЛЬНЫ ЛІКБЕЗ

# Нязначнае ДТЗ? Дапаможа еўрапратакол

***Нават невялікае ДТЗ здольна даставіць масу непрыемнасцей уладальнікам транспартных сродкаў. Гэта патрачаны час, грошы, нервы і сілы. Магчымасць абысціся на месцы здарэння так званым еўрапратаколам без звароту ў ДАІ з'явілася ў беларускіх аўтааматараў амаль восем гадоў таму. Па сутнасці, гэта спрошчаны парадак афармлення ДТЗ, якія магчымы пры пэўных умовах.***

Схему афармлення дарожна-транспартнага здарэння па спрошчаным варыянце без выкліку супрацоўнікаў ДАІ выкарыстоўваюць, калі ў ім няма пацярпелых або загінулых, прынялі ўдзел не больш за 2 аўтамабілі і ўрон быў нанесены толькі ім, абодва вадзіцелі маюць права на кіраванне транспартнымі сродкамі адпаведнай катэгорыі і страхавыя полісы абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці. Важнай умовай таксама з'яўляецца адсутнасць рознагалоссяў паміж вадзіцелямі адносна абставін і прычын ДТЗ, прычыненых аўтамабілям пашкоджанняў, а таксама прэтэнзій да фізічнага стану адзін аднаго. Шкода, зробленая кожнаму транспартнаму сродку, не павінна перавышаць 400 еўра па курсе Нацыянальнага банка.

Але найважнейшай акалічнасцю з'яўляецца тое, што павінны выконвацца адразу ўсе гэтыя ўмовы без выключэння. У адваротным выпадку трэба выклікаць супрацоўнікаў ДАІ.

Удзельнікі здарэння самастойна запаўняюць адзін бланк паведамлення аб ДТЗ, у якім пазначаюць свае персанальныя дадзеныя, абставіны і прычыны аварыі, яе вінаўніка, а таксама нанесеныя аўтамабілям пашкоджанні. Складаюць схему ДТЗ і засведчваюць еўрапратакол сваімі подпісамі.

На працягу 5 рабочых дзён пацярпелы павінен звярнуцца ў страхавую кампанію вінаватага альбо тую, дзе быў аформлены яго дагавор страхавання, прадаставіць пашкоджаны аўтамабіль для агляду і перадаць арыгінал паведамлення аб ДТЗ разам з заявай аб выплаце страхавой кампенсацыі.

Усё проста і хутка. А галоўнае, калі ўдзельнікі ДТЗ афармяць еўрапратакол, яны не будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці з боку ДАІ.

Тым не менш, замест складання еўрапратакола многія вадзіцелі нават пасля нязначных ДТЗ лічаць за лепшае выклікаць супрацоўнікаў дзяржаўтаінспекцыі.

– Бывае, што наш інспектар прыязджае на выклік, а на пашкоджанай машыне, напрыклад, толькі невялікая драпіна ці ўвагнутасць, злёгку пацёрта фарба, – гаворыць начальнік АДАІ РАУС Максім КУНДАЛЕЎ. – Гэтым самым удзельнікі невялікага дарожна-транспартнага здарэння адцягваюць супрацоўнікаў ДАІ ад больш важных участкаў работы, дзе іх прысутнасць сапраўды неабходна. Але нават у такім выпадку па жаданні вадзіцеляў інспектар можа выдаць ім бланк еўрапратакола для запаўнення.

Такім чынам, еўрапратакол дазваляе аформіць невялікае ДТЗ без выкліку супрацоўнікаў ДАІ, а пасля атрымаць страхавую выплату.

Як адзначыў вядучы ацэншчык транспартных сродкаў прадстаўніцтва Белдзяржстраха па Бялыніцкім раёне Уладзімір БОНІЧ, па стане на 18 мая да іх за выплатамі страхавой кампенсацыі за шкоду, прычыненую аўтамабілю ў выніку ДТЗ, звярнуліся 29 чалавек. З іх 12 – з еўрапратаколамі. Атрымаць яго бланк, дарэчы, можна ў страхавога агента падчас заключэння дагавора аб страхаванні свайго транспартнага сродку.

**Андрэй СУПІТАЛЁЎ.**

■ РАНС ПАПЯРЭДЖВАЕ

# Устанаві апавяшчальнік – зрабі жыццё бяспечным!

***Дзякуючы АПА на сённяшні дзень у нашай краіне выратаваны сотні людзей, у ліку якіх дзясяткі дзяцей.***




Напрыклад, 12 мая адбыўся пажар у жылым доме ў в. Крыніца Пухавіцкага раёна. У выніку спрацоўкі АПА да прыбыцця пажарных выратаваны гаспадыня дома, яе ўнучка і праўнукі.

На наступны дзень гарэла кватэра ў в. Стытычава Пінскага раёна. Дзякуючы апавяшчальніку выратаваны гаспадыня, яе дачка і зяць.

Ведайце, што прыбор рэагуе нават на невялікае задымленне. Падаючы рэзкі гукавы сігнал, ён здольны разбудзіць чалавека, які спіць, і заглушыць гук уключанай бытавой тэхнікі.

Абслугоўванне АПА не патрабуе вялікіх фінансавых выдаткаў: трэба ўсяго толькі раз у год мяняць элемент сілкавання і ачышчаць апавяшчальнікі ад пылу. Аптымальнае месца размяшчэння АПА ў жылым пакоі – цэнтральная частка столі або на сцяне.

Неабходнасць устаноўкі апавяшчальнікаў у кожным доме бясспрэчная. Пагадзіцеся, што лепш купіць пажарны апавяшчальнік, чым пазбавіцца жылля, а яшчэ страшней – страціць блізкага чалавека.

**Кацярына ЛЮБІВАЯ, інспектар ГПіУГ РАНС.**


**УВАЖАЕМЫЕ ПОТРЕБИТЕЛИ (АБОНЕНТЫ) ЖКУ!**

Белыничское УКП «Жилкомхоз» напоминает вам, что, согласно **Правилам пользования централизованными системами водоснабжения,** водоотведения (канализации) в населенных пунктах (утв. Постановлением № 788 от 30.09.2016 г.) и **Положению о порядке расчетов и внесения платы за ЖКУ и платы за пользование жилыми помещениями государственного жилищного фонда**, (утв. Постановлением Совета Министров республики Беларусь № 571 от 12.06.2014 г.):

**1.** Оказание услуги водоснабжения абонентам и потребителям, кроме пользующихся водой из уличных водоразборных колонок, и присоединение заказчиков к централизованным системам водоснабжения **осуществляются при организации ими приборного учета потребляемой холодной и горячей воды**;

**2.** Абонент, потребитель **обязаны информировать** БУКП «Жилкомхоз» **обо всех неисправностях и нарушениях в работе приборов учета, а также о срыве или нарушении целостности пломб;**

**3.** В случае выявления неисправностей и нарушений в работе приборов учета и **неинформирования** об этих нарушениях и неисправностях БУКП «Жилкомхоз» — объем потребленных услуг водоснабжения, водоотведения (канализации) для потребителя **является безучетным**, определяется и оплачивается в соответствии с законодательством (исходя из норм (нормативов) потребления, установленных местными исполнительными и распорядительными органами, по тарифам, обеспечивающим полное возмещение экономически обоснованных затрат на оказание этих услуг), для абонента – определяется и оплачивается как **при самовольном подключении;**

**4. Подключение** абонентом, потребителем **шлангов для полива приусадебных участков или иных целей** к уличному водоразбору, водопроводу до прибора учета **приравнивается к самовольному подключению;**

**5. Присоединение к централизованным системам водоснабжения без установки и использования приборов учета либо нарушения схемы подключения приборов учета, срыва пломб**, в других случаях нарушения учета потребляемой питьевой воды и отводимых сточных вод дает право нашему предприятию ограничить или **прекратить полностью подачу питьевой воды** и (или) отведение сточных вод.

Убедительно просим вас устранить безучетное водопотребление из централизованных систем водоснабжения:

- установить поверенный прибор учета водопотребления на водопроводные вводы;
- обратиться в БУКП «Жилкомхоз» для постановки приборов учета на коммерческий учет и заключения договора;
- безучетные дворовые водоразборы (колонки) отключить.

*Всем добровольно обратившимся в службы нашего предприятия для устранения самовольного (безучетного) водопотребления не будет производиться расчет сумм за потребленные объемы воды.*

Телефоны для справок: **71-548, 51-060, 51-753.**

**Администрация БУКП «Жилкомхоз».** *УНП 700082587.*


■ АХОВА ПРЫРОДЫ

# А не трэба выкідаць!

***Супрацоўнікі раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя падчас абследавання вуліцы Задруцкая райцэнтра выявілі несанкцыянаваную звалку будаўнічых адходаў.***

Бялынічанка Таццяна Ш. незаконна выкінула адходы бітага шыферу, другасныя матэрыяльныя рэсурсы, чым парушыла пункт 2 арт. 17 Закона РБ "Аб абыходжанні з адходамі", за што прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

У адпаведнасці з ч. 2 арт. 15.63 Асаблівай часткі КаАП, жанчыне даведзена заплаціць штраф памерам пяць базавых велічынь (122 руб. 50 кап.)

Хацелася б яшчэ раз нагадаць, што ўтварэнне несанкцыянаваных звалак прыносіць шкоду навакольнаму асяроддзю. І за кожнае незаконнае дзеянне чакае пакаранне.

**Юрый СІМАНАЎ, начальнік райінспекцыі ПРіАНА.**

Крымінальны пульс

■ АДНЫМ АБЗАЦАМ

# Пасля сваркі – нож у грудзі!

***Па інфармацыі начальніка штаба РАУС Дзмітрыя ІГНАТОВІЧА, з 14 па 20 мая праваахоўнікі склалі 16 адміністрацыйных пратаколаў, у тым ліку за знаходжанне ў грамадскіх месцах у стане алкагольнага ап'янення – 10, дробны крадзёж – 1, сямейны скандал – 4, непадпарадкаванне – 1.***

**Не злуй жанчыну!** Пасля сумеснага распіцця спіртнога двое жыхароў Туаліна моцна пасварыліся. Кропку ў канфлікце паставіла жанчына, якая ўдарыла нажом у грудзі свайму сужыцелю. Узбуджана крымінальная справа.

**Пабілі...** 16 мая апоўначы ў прыёмнае аддзяленне ЦРБ са шматлікімі ранамі галавы паступіў бялынічанін. Ён патлумачыў, што яго каля магазіна "Ластаўка" пабілі невядомыя. Праводзіцца праверка.

**Як у сябе дома.** Жыхар Бялынічаў патэлефанаваў у міліцыю і паскардзіўся на знаёмага, які прыйшоў да яго ў госці ў стане алкагольнага ап'янення, лёг на канапу і не жадае ўставаць. Праваахоўнікі выдалі надакучліваму госцю адміністрацыйны пратакол.

**Крадуць нават кветкі.** Бялынічанка паведаміла ў дзяжурную службу РАУС аб тым, што невядомы скраў з яе двара дзве чыгунныя пліты, а днём пазней у міліцыю паступіла паведамленне, што на клумбе каля РЦК незнаёмец парваў кветкі.

**Недзіцячая забава.** Магіляўчанін паскардзіўся супрацоўнікам РАУС на тое, што з яго гаража ў вёсцы Гуры мясцовы падлетак вынес рэчы на суму 60 рублёў. Юнак, дарэчы, знаходзіцца на ўліку ў ІСН. Вядзецца следства.

**Ганна КАВАЛЁВА.**


ЗАО «Серволюкс Агро» — торговая марка «Петруха», а/г Межисетки, Могилёвский район, на постоянную работу требуются: **РАСФАСОВЩИКИ МЯСОПРОДУКТОВ, ОБРАБОТЧИКИ ПТИЦЫ.** Заработная плата от 800 рублей. Доставка на работу транспортом нанимателя, полный социальный пакет. Телефоны для справок: **80222-210-989, 8029-747-45-60 МТС.** *УНП 700842210.*

**СТРОЙМАТЕРИАЛЫ**

**ШИФЕР** 6,90 р. **Металлочерепица** 11,5 м² р. **Профлист** для забора 7,9 м². **Кирпич печной** от 48 коп. **Кирпич облицовочный** от 35 коп. **Блоки силикатные** 90 м³. **Сетка рабица; кладочная. ОСБ, гипсокартон, сух. смеси.** ДОСТАВКА. **Тел. +37529508-05-05.**

*ИП Лагун С.А. УНП 791032463.*